# Сыходзяць энцыклапедысты. Памёр Алесь Петрашкевіч. Яму было 82 гады.

Памёр драматург і сцэнарыст, сябар рэдкалегіі газеты “Наша слова” Алесь Петрашкевіч, аўтар п'есы "Напісанае застаецца" і суаўтар сцэнара серыялу "Час выбраў нас".

Развітанне прайшло ў зале цырымоній лечкамісіі 26 жніўня.

Алесь (Аляксандр) Петрашкевіч нарадзіўся 1 траўня 1930 г. у вёсцы Пярэвалачня Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Аўтар сцэнароў мастацкіх і дакументальных фільмаў. Кандыдат гістарычных навук (1967), заслужаны работнік культуры Беларусі (1975), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) за ўдзел у падрыхтоўцы і выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Пра Алеся Петрашкевіча піша Анатоль Сідарэвіч:

- Сёння людзі развіталіся з Алесем Петрашкевічам. Ягоныя гістарычныя драмы не так для пастановак, як для чытання. Зрэшты, чаму б і не паставіць іх? Трэба толькі, каб на Петрашкевіча знайшоўся свой Мікалай Пінігін.

Адзін за адным адыходзяць энцыклапедысты. Віталь Скалабан, Янка Саламевіч… Вось і Алесь Петрашкевіч падаўся за імі.



Алесь Петрашкевіч многія свае п’есы ўпершыню надрукаваў менавіта ў газеце “Наша слова”. Зборнікі яго п’есаў выйшлі пазней і з улікам публікацый у нашай газеце. Гэтыя п’есы былі своеасаблівай гісторыяй Беларусі ад Петрашкевіча. Не дарэмна ж некаторыя гісторыкі прызнаюць іх за гістарычныя навуковыя творы і на поўным сур’ёзе выкарыстоўваюць як першакрыніцы. Сёння імя А. Петрашкевіча ў спісе рэдкалегіі “Нашага слова” абведзена чорнай рамкай, у наступным нумары яно знікне, але не знікне зробленае і напісанае. Гісторыя ад Петрашкевіча засталася для беларусаў.

Рэдакцыя газеты “Наша слова”, сакратарыят ТБМ выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім слыннага беларуса. Мяккай зямелькі і светлых успамінаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ